*УДК 37.091.33:004.9:821.161.3-1/-4*Я.Колас*
***Т. А. Фіцнер***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ВЫВУЧЭННЕ БІЯГРАФІІ І ТВОРЧАСЦІ Я. КОЛАСА З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІКТ У ВНУ

На сённяшні дзень выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій (ІКТ) у сістэме адукацыі становіцца нормай на ўсіх яе ступенях. Гэтаму спрыяе развіццё цывілізацыі ў цэлым. Штуршком для актыўнага выкарыстання ІКТ у апошні час стала пандэмія і звязаныя з ёй наступствы – эпідэмічныя абмежаванні. Не замяняючы сабой жывую камунікацыю, ІКТ тым не менш спрыяюць набыццю навыку вучыцца і здабываць веды самастойна (улічваючы патрэбу ў іх пастаянным абнаўленні па прычыне хуткага “старэння”), уменню арыентавацца ў сучасным інфармацыйным асяроддзі, прадуктыўна працаваць, самаразвівацца і самарэалізоўвацца. Асноўнымі напрамкамі прымянення ІКТ [1] з’яўляюцца наступныя: мультымедыя як ілюстрацыйны сродак, камп’ютар як сродак кантролю і карэкцыі ведаў; камп’ютар як сродак самаадукацыі. Мультымедыя (у дадзеным выпадку тэрмін выкарыстоўваецца і ў значэнні носьбіта інфармацыі і, як спалучэнне розных відаў інфармацыі: тэкставых слайдаў, а і фотаздымкаў, малюнкаў, аўдыё- і відэазапісаў і інш.), на наш погляд, найбольш мэтазгодна і прадуктыўна выкарыстоўваць для вывучэння біяграфіі і творчасці пісьменнікаў на лекцыях па літаратуры ў форме прэзентацый, выкананых у рэжыме Power Point. Іх зручна выкарыстоўваць і пры дыстанцыйным навучанні.

Камп’ютар / смартфон у якасці сродку самаадукацыі актыўна выкарыстоўваецца студэнтамі падчас падрыхтоўкі да практычных заняткаў. У яго капіруюцца/ спампоўваюцца/ загружаюцца лекцыі па вывучаемай дысцыпліне (ЭВМК па дысцыпліне можна знайсці на сайце ўніверсітэта) і мастацкія тэксты (менавіта электронным, а не папяровым падручнікам і кнігам аддаюць перавагу цяпер студэнты). Зразумела, што веды папаўняюцца і замацоўваюцца шляхам самаадукацыі. У гэтым студэнтам таксама спрыяе / дапамагае камп’ютар (або смартфон). Дадатковую інфармацыю, не выкарыстаную / не задзейнічаную падчас лекцыі, выкладчык скідвае студэнтам у выглядзе спасылак на электронныя крыніцы: гэта і спампаваныя дадатковыя кнігі па выкладаемай дысцыпліне, і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спасылкі на віртуальныя музеі пісьменнікаў і неабходныя для чытання мастацкія тэксты, таксама аўдыё- і відэаматэрыялы. Пры дапамозе камп’ютара / смартфона студэнты маюць магчымасць выканаць тэсты для самакантролю, рыхтуючыся такім чынам да экзамена па дысцыпліне ў сістэме dot.3.

Спынімся на такім напрамку прымянення ІКТ, як мультымедыя пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху Я. Коласа, 140-годдзе з дня нараджэння якога будзе адзначацца ў бягучым годзе.

У вучэбнай праграме ВНУ для студэнтаў 2 курса спецыяльнасці “Беларуская філалогія” на вывучэнне творчасці Я. Коласа адводзіцца 6 лекцыйных гадзін, 2 з якіх выносяцца на самастойнае вывучэнне матэрыялу (КРС), а таксама 4 гадзіны практычных заняткаў. За гэтыя гадзіны выкладчык павінен не толькі актуалізаваць веды студэнтаў па біяграфіі і творчасці Я. Коласа, атрыманыя ў старэйшым і сярэднім звяне агульнаадукацыйнай школы, але таксама сістэматызаваць іх і максімальна пашырыць. Знаёмства з біяграфіяй класіка ў ВНУ прадугледжвае (акрамя ведання асноўных датаў і фактаў з жыцця пісьменніка) разуменне фарміравання Я. Коласа як творчай асобы, уплыву на гэты працэс сямейных і гістарычных абставін, ролі адукацыі ў гэтым працэсе; усведамленне маштабнасці і ўнікальнасці таленту пісьменніка, яго ролі ў развіцці айчыннага мастацтва слова. Знаёмства з творчасцю (паэзіяй, прозай, эпасам) мае на мэце знаёмства не толькі з мастацкімі тэкстамі, але і ўсведамленне ўклада сапраўды народнага пісьменніка ў асэнсаванне беларусамі сваёй ідэнтычнасці, непаўторнасці сябе як этнасу; разуменне, што Я. Колас – беларускі Гамер, стваральнік нацыянальнага эпасу, класік, творчасць якога актуальная і ў XXI стагоддзі. Праграма прадугледжвае і знаёмства з найбольш значнымі навуковымі даследаваннямі айчынных літаратуразнаўцаў, прысвечанымі творчасці сёлетняга юбіляра.

У выпадку, калі выкладчыку не хапае часу, у сетцы Інтэрнэт можна знайсці ўжо гатовыя прэзентацыі (да прыкладу, рэзентацыю “Жыццё і творчасць Я. Коласа”, падрыхтаваную Акружной Людмілай (Інфаўрок): https://infourok.ru/prezentaciya-pa-belaruskay-litaraturi-na-temu-zhiccyo-i- tvorchasc-yakuba-kolasa-2485368.html; таксама на “Настаўніцкім партале” можна пакарыстацца прэзентацыяй “Якуб Колас. Жыццё і Творчасць”: https://uchitelya.com/literatura/81090-prezentaciya-yakub-kolas-zhycce- tvorchasc.html і інш.).

Шлях стварэння ўласнай прэзентацыі на першым этапе больш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

затратны ў часавым вымярэнні (у гэтым яго бясспрэчны мінус), аднак і больш карысны, бо дае магчымасць творчай працы, маніторынгу сеткі інтэрнэт і арыентаванасці ў матэрыяле, які потым можна прапанаваць студэнтам, каб ужо яны ў сваю чаргу не трацілі марна свой час, а карысталіся вызначанымі, канкрэтнымі матэрыяламі. Задача выкладчыка таксама размежаваць матэрыял, вызначыць, што неабходна падаць падчас лекцыі, а што пакінуць на самастойнае і дадатковае вывучэнне пры падрыхтоўцы да КРС і практычных заняткаў. Такім чынам, ва ўласную лекцыю-прэзентацыю, прысвечаную жыццю і творчасці Я. Коласа, варта ўключыць:

– разнастайныя фотаздымкі, якія даюць уяўленне пра пісьменніка і яго сям'ю (партрэты пісьменніка рознага ўзросту, яго жонкі і сыноў, якія можна знайсці на сайце "Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі": https://narbel.bsu.by/z-syamejnaga-arxiva-yakub-kolas/; фота дома, дзе пісьменнік жыў пасля ВАВ, помнікаў паэту, музеяў; фота першага зборніка паэзіі "Песні жальбы", паэм, трылогіі, апошняга Збору твораў, ілюстрацый да найбольш значных твораў пісьменніка і інш.), што будзе ствараць атмасферу часу, у які жыў пісьменнік; звярнуцца да электроннага рэсурса "Якуб Колас. Цікавыя звесткі": https://belarusianheroes.com/yakub.kolas і выкарыстаць іх пры падачы біяграфіі народнага пісьменніка.

– аўдыёінфармацыю і відэаматэрыялы (на Беларускай палічцы [2] можна не толькі пачытаць тэксты шматлікіх твораў Я. Коласа, напрыклад, паэм "Новая зямля" і "Сымон-музыка", трылогіі "На ростанях", "Казкі жыцця", там змешчаны таксама іх аўдыёверсіі; сайт дае магчымасць паслухаць песні на шэраг вершаў Я. Коласа ("Вясна", "Ганна", "Зіма", "Каханне", "Кахання нашы галасы", "Мой родны кут", "Ноч пад Новы год", "Радасць", "Роднаму краю", "Святлана", "У турме"); там таксама змешчаны відэаматэрыялы пра пісьменніка).

– відэахостынг/сайт Youtube таксама дае шырокія магчымасці для знаёмства з жыццём і творчасцю класіка. Дзякуючы яму можна, напрыклад, наведаць Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа: https://www.youtube.com/watch?v=0ns4Kr7Z4xg; пабываць на Піншчыне, дзе настаўнічаў пісьменнік у маладосці: **Ошибка! Недопустимый объект гиперссылки.**;

У студэнтаў цяпер ёсць выбар, чытаць мастацкія тэксты, слухаць іх,ці глядзець іх экранізацыі. Бясспрэчна, што філолагі найперш павінны чытаць творы, але ўжо прачытаныя некалі ў школе творы можна ўзнавіць шляхам праслухоўвання ці прагляду мастацкага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

фільма, у чым таксама паспрыяе Youtube. Там можна паглядзець экранізацыю “Новай зямлі” (2 часткі): https://www.youtube.com/watch?v=aav5aPL8NBw; тэлефільм: “Сымон-музыка”: https://www.youtube.com/watch?v=aav5aPL8NBw; паслухаць паэму “Сымон-музыка” ў выкананні Міхася Міцкевіча, малодшага сына Якуба Коласа. (Ч. 1): https://www.youtube.com/watch?v=aav5aPL8NBw; (Ч. 2): https://www.youtube.com/watch?v=CK4TDjpOako. На лекцыі можна праслухаць толькі невялікія ўрыўкі з паэм ці паглядзець кавалак экранізацыі з мэтай зацікавіць студэнтаў.

Вядома, што прагледзець усю інфармацыю, прадстаўленую сеткай Інтэрнэт, падчас дзвюх лекцый-прэзентацый немагчыма, таму зрабіць адбор матэрыялу павінен выкладчык і, паўторымся, размежаваць, што выкарыстаць падчас лекцыі, а што параіць студэнтам для самастойнага прагляду-праслухоўвання, адбіраючы найбольш значныя з прапанаваных у сеціве крыніц.

У заключэнне зазначым, што выкарыстанне ІКТ на занятках па вывучэнні біяграфіі і творчасці пісьменнікаў пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў-філолагаў ёсць патрабаванне часу і яго немагчыма і нельга ігнараваць.

**Літаратура**

1. Драніца, Н. В. Інфарматыўна-камунікатыўныя тэхналогіі на ўроках фізікі / Н. В. Драніца (Dranitsa.doc) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http:// www.academy.edu.by. – Дата доступу : 28.02.2022.

2. Колас, Я. Творы / Я. Колас // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Jakub_Kolas/. – Дата доступу : 26.02.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ